# *КАНТЭКСТ – НАША ЎСЁ*

**12 лютага 2026 года створаная Гродзенскім абласным аддзяленнем Саюза пісьменнікаў Беларусі Грамадская літаратурная школа займалася вывучэннем чарговага сродку мастацкай выразнасці, тэма занятку: «Сродкі мастацкай выразнасці. Увасабленне».**

Калі апусціць усю лірыку – эмоцыі, дух, атмасферу сустрэчы *(калі ласка, глядзіце фота ніжэй)*, – і рэзюмаваць тое, што атрымалася, як кажуць, у сухім астатку, – безумоўна, памыліліся тыя, хто чакаў простай і лёгкай працы. Слухачам, а гэта па традыцыі аматары літаратуры, практыкуючыя аўтары розных пакаленняў, не было проста. У працэсе знаёмства з функцыямі і відамі ўвасабленняў чакала велізарная колькасць неадназначных момантаў, якія патрабавалі дадатковага, больш глыбокага пранікнення ў тэму. І тады на авансцэну выходзіць вельмі значны фактар – Яго Вялікасць Кантэкст.

Вынесены ў загаловак выраз «Кантэкст – наша ўсё» стаў слоганам, лейтматывам лютаўскага занятку Гродзенскай грамадскай літаратурнай школы. Найбольш актыўна сябе праявілі філолагі: ветэран педагагічнай працы, кандыдат у шэрагі СПБ, беларускі празаік Ірына Салата; кіраўнік Гродзенскага гарадскога літаб'яднання «Надзея», пісьменніца-педагог Юлія Чамярыс; даўні сябар нашай літшколы, гродзенская паэтка Алена Шаламіцкая. Сумеснымі намаганнямі ўдалося захаваць трохчастковую формулу занятку – тэарэтычны, практычны і аналітычны блокі. Самым яркім і прадуктыўным стаў момант стварэння тэкстаў з прапанаванымі словамі.

Важнасць нашых грамадска-адукацыйных сустрэч яшчэ і ў тым, што з кожным заняткам мы ўсё больш кансалідаваны. А яшчэ мы здольныя пераключацца, пераводзячы нашу працу ў рэжым аператыўнай нарады для асвятлення і абмеркавання актуальных пытанняў, праблем, планаў на бліжэйшую перспектыву. Бясспрэчна: як і раней, пераважаць у жыццядзейнасці Грамадскай літаратурнай школы ГрАА СПБ будуць цяпло ўзаемнай сяброўскай увагі аднадумцаў і павага да нашай агульнай справы – літаратуры.



**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**На фота:** ў створанай Гродзенскім абласным аддзяленнем СПБ Грамадскай літаратурнай школе адбыўся апошні зімні занятак, тэма: «Сродкі мастацкай выразнасці. Увасабленне». Офіс ГрАА СПБ, 12 лютага 2026 года.




БЕЛАРУСКІ ЧАС
ПОДДЕРЖКА ТЕПЛОМ




ПАДЗЯКА
Дыплом


Новым годам
Калядамі!
ВЕЛИКОЙ
BÓG
MNIE
WYBRAŁ


BÓG
MNIE
WYBRAŁ




ДИПЛОМ
ГРАМАТА
ПАДЗЯКА




BÓG
MNIE


ГАНАРОВАЯ ГРАМАТА
ДИПЛОМ
ДЫПЛОМ
ГРАМАТА
ГРАМАТА
ГАНАРОВАЯ ГРАМАТА
ПАДЗЯКА
ГАНАРОВАЯ ГРАМАТА
ПОЧЕТНАЯ ГРАМОТА


Январь Студзень January
Февраль Люты February
ПАДЗЯКА
ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ ГА"САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ"




ПАДЗЯКА
Диплом
ГАНАРОВАЯ ГРАМАТА
ПОЧЕТНАЯ ГРАМОТА


BÓG
MNIE


ПАДЗЯКА
ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ
ГА"САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ"
Дыплом
узнагароджваецца


Дыплом
узнагароджваецца



Да сустрэчы вясной!
*Фота* Юліі Чамярыс